

# Шахматная казка

## Урок пазакласнага чытання па творах К. С. Хадасевіч-Лісавой у III—IV класах

**ЗАДАЧЫ:** пазнаёміць з кнігай К. С. Хадасевіч-Лісавой "Загадка прынцэсы Агнэсы"; удасканальваць навык свядомага, правільнага, выразнага чытання; развіваць чытацкія ўменні — устанаўліваць сэнсавыя сувязі паміж падзеямі, знаходзіць і вылучаць патрэбную інфармацыю з тэксту, аналізаваць учынкі герояў, характарызаваць дзеючых асоб на падставе іх паводзін, выказваць свае адносіны да прачытанага; развіваць звязнае вуснае маўленне, лагічнае мысленне, фантазію вучняў; фарміраваць навыкі групавога ўзаемадзеяння; выхоўваць кемлівасць, уважлівасць, цікавасць да шахматнай гульні.

**АБСТАЛЯВАННЕ:** кніга К. С. Хадасевіч-Лісавой "Загадка прынцэсы Агнэсы"; малюнкі шахмат у "чароўным" пакеціку; шахматы, шахматная дошка; карткі з заданнямі ("зашыфраваная" шахматная дошка) для кожнага вучня; карткі са словамі — рысамі характару, заданні для работы ў групах; малюнкі да казкі, падрыхтаваныя вучнямі; відэасустрэча з К. С. Хадасевіч-Лісавой *(гл. дыск да часопіса "Пачатковая школа" № 4/2020)*.

**У МУЛЬТЫМЕДЫЙНЫМ ДАДАТКУ:** дадаткі 1–3.

### I. АРГАНІЗАЦЫЙНЫ ЭТАП.

**Настаўнік.** Добры дзень, паважаныя сябры! Пачаць нашу сустрэчу я хачу з наступных слоў: "Гэта казка — сапраўдная машына часу, бо яна здольная перанесці сваіх чытачоў у глыб стагоддзяў" [1]. Якая казка пачынаецца з гэтых слоў? *("Загадка прынцэсы Агнэсы".)* Сёння я прапаную вам абмеркаваць яе змест, а таксама пабываць у чароўным свеце шахмат.

### II. ЭТАП ЗАМАЦАВАННЯ ВЕДАЎ.

Абмеркаванне і аналіз зместу казкі "Загадка прынцэсы Агнэсы".

**Настаўнік.** Дзе адбываюцца падзеі ў казцы? *(У раскошным каралеўскім палацы.)* Якая падзея падштурхнула тату-караля ладзіць баль? *(Баль быў арганізаваны з нагоды дня народзінаў прынцэсы і агледзін.)* Як вы разумееце слова "агледзіны"? *(Агледзіны — гэта абрад знаёмства жаніха і яго сваякоў з нявестай.)* Як выглядала прынцэса? Знайдзіце апісанне ў тэксце. *(Прынцэса была вельмі прыгожай, стройнай, разумнай, у яе былі "доўгія вейкі".)*

Настаўнік звяртае ўвагу на выставу малюнкаў, арганізаваную да пачатку ўрока.

**Настаўнік.** Якое заданне дала Агнэса сваім гасцям? За каго яна паабяцала выйсці замуж? *(За таго, хто пераможа ў вайне.)*

Як павінны былі ваяваць жаніхі? *(Седзячы моўчкі, без штыкоў і стрэльбаў.)*

Якія дзіўныя жывёлы павінны былі з'явіцца на полі? *(Коні без капытоў і сланы без хобатаў.)*

Ці спадабалася гасцям заданне прынцэсы? Як яны адрэагавалі? Як вы думаеце, чаму? Знайдзіце і прачытайце радкі, якія з'яўляюцца доказам вашага адказу. *("...Некаторыя вырашылі, што нават дзеля прыўкраснай прынцэсы разам з багатым пасагам не гатовыя яны пайсці ў такі жудасны бой..." "Вар'ятка! ...Прынцэса з глузду з'ехала! Я такую жонку браць перадумаў! — пацiснуў плячыма стары сусед-імператар і адразу выправіўся дадому".)*

Што абазначае выраз "з'ехаць з глузду"? *(Страціць розум, развагу.)*

Хто адважыўся выканаць заданне прынцэсы? *(Грум Ян.)* Хто такі грум? *(Грум — гэта слуга, які верхам суправаджае экіпаж.)*

З кім збіраўся "ваяваць" Ян? *(З прынцэсай Агнэсай.)*

Успомніце, якім чынам Ян і Агнэса вызначалі колер свайго "войска"? Што прапанаваў юнак? *("Няхай гэта вызначыць спадар Рандом!")*

Як вы растлумачыце значэнне слова “рандом”? *(Выпадковасць.)*

Якое заданне “зашыфравала” Агнэса для будучага жаніха? *(Перамагчы ў шахматнай гульні.)* А вы, калі чыталі казку, адразу здагадаліся, пра што ідзе размова?

Ці пагадзілася Агнэса выйсці замуж за Яна? Чаму? *(Прынцэса пагадзілася выйсці замуж. Ян спадабаўся ёй. Юнак аказаўся разумным, кемлівым, знаходлівым, смелым. Для яго галоўнае багацце, шчасце — мець вялікую сям’ю.)*

Якія словы з тэксту пацвярджаюць, што Ян быў добрым, старанным? *(“...Яе любімага Праменьчыка ён сумленна даглядаў, конь давяраў яму. А так бывае толькі тады, калі чалавек добры, жывёлы гэта адчуваюць”.)*

Давайце ўспомнім, як Агнэса адносілася да свайго бацькі? *(З павагай. Яна раілася з ім, абмяркоўвала заданне.)* Як бацька ставіўся да дачкі, яе жаданняў? *(Кароль — клапатлівы, уважлівы бацька. Ён падтрымаў выбар дачкі.)*

Хто з’яўляецца галоўным героем казкі? *(Прынцэса Агнэса.)* Якія словы вы падабралі б для характарыстыкі прынцэсы? Выберыце рысы характару з пераліку прапанаваных. Абгрунтуйце.

*На дошку вывешваюцца карткі:*

| | |
|---|---|
| разумная | ганарлівая |
| абыякавая | уважлівая |
| рашучая | безадказная |

**Настаўнік.** Успомніце, як прынцэса характарызавала сама сябе. *(“Я асоба рамантычная...”)*

Як вы думаеце, чаму Агнэса прапанавала будучаму жаніху заданне-загадку, звязаную з гульнёй у шахматы? *(Гэта няпростая гульня, якая патрабуе знаходлівасці, кемлівасці і ўвагі.)* Ці кожны чалавек, на ваш погляд, здольны гуляць у шахматы? Хто з вас умее гуляць у шахматы? Ці гуляюць у шахматы ў вашай сям’і? Што такое шахматы?

Шахматы — лагічная настольная гульня для двух гульцоў. Яе радзімай з’яўляецца Індыя. Сёння ў шахматы гуляюць мільёны людзей ва ўсім свеце.

Узрост шахматных фігурак, якія час ад часу выкопваюць археолагі ў розных мясцінах Беларусі, дасягае 1000 гадоў. Каля Замкавай гары ў Гродна як напамін пра шахматную фігурку XII ст., якая была знойдзена на тэрыторыі Беларусі, усталявана скульптура шахматнай ладдзі.

***Гульня “Што вы ведаеце пра шахматы?”***

**Настаўнік.** У маім “чароўным” пакецiку знаходзяцца шахматныя фігуры, якія згадваюцца ў казцы. Вы будзеце выцягваць адну з іх і расказваць, што вам пра яе вядома *(гл. дадатак 1)*. Я пачну гульню.

Настаўнік выцягвае шахматную фігуру.



**Настаўнік.** Фігуру **каралевы** па-іншаму называюць **ферзь**. Яна самая моцная, можа хадзіць у любым кірунку: наўскасяк, па гарызанталі ці вертыкалі. На полі два ферзі — чорны і белы.

Затым настаўнік паказвае на шахматнай дошцы, як ходзяць фігуры.

| | |
|---|---|
|  | **Слон** ходзіць наўскасяк |
|  | **Конь** ходзіць літарай “Г”, можа пераскокваць праз фігуры |
|  | **Ладдзя** ходзіць па гарызанталі ці па вертыкалі |
|  | **Кароль** — галоўная фігура ў шахматах. Ён ходзіць наўскасяк, па гарызанталі, па вертыкалі, але толькі на адну клетку. Галоўная мэта гульні ў шахматы — аб’явіць мат каралю |
|  | **Пешка** — самая слабая фігура. Спачатку пешка можа пайсці на адну клетку ці на дзве прама па вертыкалі, далей — толькі на адну; пешка б’е наўскасяк на адну клетку, але толькі наперад. Калі пешка даходзіць да апошняга для яе раду, яна ператвараецца ў любую фігуру свайго колеру, акрамя караля |

**Настаўнік.** Вы шмат ведаеце пра шахматныя фігуры! Думаю, прынцэса Агнэса з задавальненнем пагуляла б з вамі ў шахматы!

***Работа ў групах***

**Настаўнік.** Я падрыхтавала для вас яшчэ некалькі цікавых заданняў.

Прапаную прыняць удзел у гульні “Так ці не”. Вам трэба прачытаць і абмеркаваць сцвярджэнне.

Навучэнцы па чарзе выцягваюць аркушы з пытаннямі *(гл. дадатак 2)*.

1. Слова “праменьчык” у казцы ўжываецца ў значэнні “вузкая паласа святла, якая ідзе ад якога-небудзь прадмета, які свеціцца”. Так ці не? Дакажыце. *(Не. Праменьчык — мянушка любімага белага каня Агнэсы. У тэксце гэта слова запісана з вялікай літары.)*
2. Жадаючых выканаць заданне прынцэсы Агнэсы было шмат. Так ці не? Чаму? *(Не. Усе вырашылі, што трэба распачаць сапраўдную вайну. Ніхто, акрамя Яна, не здагадаўся, пра якое поле бітвы гаварыла Агнэса і што на гэтым полі трэба рабіць.)*
3. У шахматнай партыі перамагла Агнэса. Так ці не? *(Не. У гульні не прагучала “Шах і мат!” Была нічыя.)*
4. Уменне гуляць у шахматы можа спатрэбіцца ў жыцці. Так ці не? Дакажыце. *(Так. Шахматы вучаць валодаць сабой, думаць, разважаць, аналізаваць, знаходзіць нестандартныя рашэнні.)*

**Настаўнік.** Сапраўды так. Падчас шахматных спаборніцтваў выпрацоўваецца воля і імкненне да перамогі, адказнасць за прыняцце рашэння. Хачу прыгадаць словы мысліцеля: “Хто ведае тайну шахмат, той ведае і тайну жыцця!”

***Знаёмства з новай кнігай К. С. Хадасевіч-Лісавой “Загадка прынцэсы Агнэсы”***

Настаўнік паказвае вучням кнігу “Загадка прынцэсы Агнэсы”.




**Настаўнік.** Сёння на ўроку мы аналізавалі казку “Загадка прынцэсы Агнэсы”. Прапаную вам разгледзець кнігу Кацярыны Хадасевіч-Лісавой, дзе гэта казка надрукавана. У кнізе змешчаны яшчэ дзве цікавыя казкі: “Пачастунак для Яго Вялікасці” і “Шахматная каралева”. Усіх дзеючых асоб аб’ядноўвае старажытная гульня — шахматы. Дзякуючы ёй героі кнігі змаглі развеяць злыя чары, знайсці сапраўднае каханне, стаць шчаслівымі.

Звярніце ўвагу на казачныя ілюстрацыі ў кнізе, якія стварыла мастачка Анастасія Балыш. Ці такой вы ўяўлялі сабе прынцэсу Агнэсу?

Вучні гартаюць кнігу, разглядваюць ілюстрацыі.

**Настаўнік.** Думаю, што вы з задавальненнем будзеце чытаць новыя казкі Кацярыны Хадасевіч-Лісавой і ўдасканальваць уменне гуляць у шахматы.

***Заданне “Зашыфраваная шахматная дошка”***

Кожны вучань атрымлівае картку з заданнем *(гл. дадатак 3)*.

C4-e6-h1-h7-a8-a2-f3-g5    c7-d2-b5

| | a | b | c | d | e | f | g | h | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 8 | Ч | | О | Ж | Г | | | М | 8 |
| 7 | | | Ф | | Р | Я | | А | 7 |
| 6 | Д | | Ц | | А | | | | 6 |
| 5 | | Я | | | Ь | | Я | | 5 |
| 4 | Ю | | К | | | Р | | Л | 4 |
| 3 | | Т | | | | А | | Э | 3 |
| 2 | Н | | | Е | | | А | | 2 |
| 1 | Ў | | Ш | | В | | О | З | 1 |
| | a | b | c | d | e | f | g | h | |

**Настаўнік.** Што вы бачыце замест фігур? *(Літары.)* На дошцы “схаваліся” два словы. На перакрыжаванні лацінскай літары і лічбы знаходзіцца беларуская літара. Прапаную выканаць заданне самастойна і разгадаць зашыфраваныя словы.

Першыя дзве літары настаўнік і вучні “расшыфроўваюць” разам.

**Настаўнік.** Якія словы ў вас атрымаліся? *(Казачная фея.)* Ці ведаеце вы, хто з’яўляецца Казачнай феяй? *(Кацярына Станіславаўна Хадасевіч-Лісавая.)*

Гэта аўтар казкі, якую мы сёння аналізавалі.

Настаўнік прапануе паглядзець відэасустрэчу з пісьменніцай.

**III. ЭТАП ІНФАРМАВАННЯ АБ ДАМАШНІМ ЗАДАННІ.**

**Настаўнік.** Паважаныя сябры, прапаную вам выканаць дома творчае заданне. Паспрабуйце скласці загадку, у якой адгадкай будзе слова *шахматы*. Поспехаў вам! Да новых сустрэч!

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Хадасевіч-Лісавая, К. С. Загадка прынцэсы Агнэсы / К. С. Хадасевіч-Лісавая. — Мінск : Выдавецкі дом “Звязда”, 2021. — 64 с.

**Н. М. АНТАНОВІЧ,**
дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі БДПУ, кандыдат педагагічных навук, дацэнт;
**А. С. ШЫРКО,**
студэнтка факультэта пачатковай адукацыі БДПУ